View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk brought to you by CORE



**УДК 947.6(476)(=432.1)«192»**

# НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАЕ РАЗВІЦЦЁ ТАТАРСКІХ АБШЧЫН НА ТЭРЫТОРЫІ БССР У 20 – 30 ГАДЫ XX СТАГОДДЗЯ

***С.У. ГРЫБАВА***
***(Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт)***

*Разглядаецца нацыянальна-культурнае развіццё татарскага насельніцтва БССР у 20 – 30-я гады XX стагоддзя, якое адбывалася пад уплывам палітыкі савецкай дзяржавы ў дачыненні да нацыянальных меншасцей на яе тэрыторыі. Аўтар прыводзіць дадзеныя аб спробах нацыянальнага будаўніцтва ўлад у 1920-я гады (стварэнне татарскай хаты-чытальні, нацыянальнага школьніцтва, татарскіх нацыянальных кааператываў), але адзначае іх павярхоўнасць, палавінчатасць і пераход у 1930-я гады да сапраўднага вынішчэння праяў нацыянальнай актыўнасці ў культурным, рэлігійным, грамадска-палітычным жыцці, што суправаджалася неабгрунтаванымі абвінавачваннямі і рэпрэсіямі. Асноўнай задачай нацыянальнай палітыкі з'яўлялася саветызацыя нацменшасцей, у тым ліку і беларускіх татар, фарміраванне атэістычных поглядаў, камуністычных ідэалаў. Паказана, што жыццё татарскага насельніцтва ў складзе БССР знаходзілася пад уплывам тых ідэалагічных працэсаў, сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных пераўтварэнняў, якія мелі месца ў рэспубліцы.*

**Уводзіны.** Татарская супольнасць Беларусі ў выніку гістарычных працэсаў (на падставе Рыжскага мірнага дагавора ад 18 сакавіка 1921 года і Акта ўз'яднання Віленскага краю з Рэспублікай Польшча, які прыняў Устаноўчы сход у Варшаве 22 сакавіка 1922 года) знаходзілася ў складзе розных дзяржаў: ІІ Рэчы Паспалітай і БССР. У дадзеным артыкуле мы спынімся на становішчы татарскіх абшчын у БССР у міжваенны перыяд, разгледзім дынаміку іх развіцця, якая ў значнай ступені вызначалася палітыкай савецкай дзяржавы ў дачыненні да нацыянальных меншасцей на яе тэрыторыі.

Канфесійная прыналежнасць, а менавіта веравызнанне ісламу, з'яўляецца для татараў Беларусі галоўным фактарам, які спрыяў захаванню іх нацыянальнай самасвядомасці, этнічнага самавызначэння ў іншарэлігійным і іншаэтнічным асяроддзі. Беларускія татары, адасобленыя на працягу стагоддзяў ад ісламскага свету, зберагалі сваю веру, традыцыі і культуру. Таму, безумоўна, нацыянальная і рэлігійная палітыка дзяржаў, у якіх татары апынуліся, была для іх надзвычай важнай.

**Асноўная частка.** Становішча татарскай нацыянальнай меншасці на тэрыторыі БССР было дастаткова складаным і супярэчлівым. Трэба адзначыць, што паводле перапісу 1939 года колькасць татарскага насельніцтва ў БССР на 17 студзеня 1939 года складала 3731 чалавек, з іх гарадскога насельніцтва – 2405 чалавек, сельскага – 1326 чалавек. Гістарычна склалася так, што рэгіянальная лакалізацыя татараў была абмежавана тэрыторыяй Мінскай вобласці [1, с. 70 – 71]. Тут паселішчы (абшчыны) татараў у асноўным былі сканцэнтраваны ў г. Мінску, Капылі, у м. Смілавічы і ва Уздзе, дзе пэўны час дзейнічалі мячэці [2, с. 245].

У межах працэсу беларусізацыі ўладамі БССР у 20-я гады рабіліся спробы нацыянальнага будаўніцтва ў дачыненні да нацыянальных меншасцей краіны. Гэта палітыка, як вядома, праводзілася ў адпаведных кірунках (кадравая палітыка, ажыўленне дзейнасці Саветаў, у тым ліку нацыянальных, дасягненне раўнапраўя рэгіянальных моў, стварэнне нацыянальных школ і культурных установ, арганізацыя нацыянальных кааператыўных гаспадарак і інш.), некаторыя з якіх у канцы 20-х гадоў закранулі і беларускіх татараў.

Каб далучыць насельніцтва да ўдзелу ў камуністычным будаўніцтве, улады БССР лічылі неабходным правесці іх ідэйна-палітычную падрыхтоўку, у тым ліку і шляхам культурна-асветніцкай дзейнасці. Цэнтрамі такой падрыхтоўчай працы ў гарадах і вёсках былі нацыянальныя клубы ці хаты-чытальні.

Вясной 1928 года ў Татарскай слабадзе г. Мінска, якая размяшчалася ў раёне сучасных вуліц Астроўскага, Вызвалення, Дзмітрава, а таксама на месцы, дзе сёння размешчаны Дом кнігі і гасцініца "Юбілейная", была адчынена татарская хата-чытальня [3, с. 143]. Дарэчы, тэрыторыя паміж Татарскай слабадой і Свіслаччу называлася Татарскімі агародамі – месца кампактнага пражывання татараў у горадзе. Пры чытальні працавалі палітычны гурток і гурток па вывучэнні татарскай мовы (наведвалі каля 60 чалавек). Планавалася арганізаваць гурток «Бязбожнік» і лікбез. Выходзіла газета «Татарскае слова», дзе публікаваліся матэрыялы аб жыцці і быце татарскага насельніцтва і рабоце хаты-чытальні. Выпісваліся газеты на татарскай мове. Папаўнялася хата-чытальня кніжкамі на нацыянальнай мове [4, л. 8].

Але 8 снежня 1928 года Мінская акруговая нацыянальная камісія, заслухаўшы справаздачу аб рабоце татарскай хаты-чытальні, адзначыла «слабы тэмп разгортвання палітыка-масавай работы сярод татарскага і ваколічнага насельніцтва іншых нацыянальнасцей, у прыватнасці, зусім не праведзена работа ў напрамку асвятлення пытанняў нацыянальнай палітыкі і інтэрнацыянальнага выхавання», вы-

явіла «нацыянальна-шавіністычныя настроі класава чужых элементаў у савеце хаты-чытальні», у сувязі з гэтым планаваліся перавыбары членаў савета. Камісія таксама ўказала, што «мэта хаты-чытальні абслугоўваць разам з татарскім працоўным насельніцтвам і акраіннае жыхарства іншых нацыянальнасцей таго ж раёна, узяць напрамак на асвятленне палітыкі партыі і Савецкай улады ў нацыянальным пытанні, інтэрнацыянальнае выхаванне мас, папоўніць хату-чытальню літаратурай на іншых нацыянальных мовах, у прыватнасці, на яўрэйскай і польскай» [5, л. 2 – 3]. Так, 12 снежня 1928 года дацэнтам В.А. Сербентам была прачытана лекцыя «Імперыялізм і рэвалюцыйны рух на Усходзе». Планавалася арганізацыя перыядычных лекцый. Хата-чытальня павінна была ў сваёй працы ісці па лініі барацьбы з непісьменнасцю і рэлігіяй. Перад ёй была пастаўлена задача – вызваленне татарскага насельніцтва з-пад уплыву мячэці [4, л. 8]. У канцы 1929 года татарская хата-чытальня была пераўтворана ў раённую, г. зн. была пазбаўлена нацыянальнага статусу. Не былі таксама рэалізаваны задумкі Белдзяржмузея па стварэнні экспазіцыі, прысвечанай гісторыі і культуры татараў Беларусі [6, с. 225].

Адным з кірункаў палітыкі савецкіх улад у дачыненні да нацыянальных меншасцей краіны было стварэнне іх нацыянальнага школьніцтва, якое выканала найбольшую працу па пераадоленні непісьменнасці ў сваім асяроддзі. Гэта стала магчымым у сувязі з дастаткова высокім працэнтам пісьменных сярод нацыянальных меншасцей у сярэдзіне 20-х гадоў ХХ стагоддзя. Дарэчы, з ліку гарадскога татарскага насельніцтва пісьменных было 60 % (з іх мужчын – 71 %, жанчын – 40 %), сельскага – 52 % (з іх мужчын – 65 %, жанчын – 30 %). Усяго 60 % ад агульнай колькасці татарскага насельніцтва краіны па даных на 1926 год складалі пісьменныя [7, с. 133]. Але татары ў Савецкай Беларусі не мелі магчымасці рэалізаваць свае запатрабаванні. У жніўні 1927 года ўздзенскія татары правялі сход, на якім звярнуліся да ўлад з просьбай адкрыць нацыянальную татарскую школу. Але дадзеная просьба нават не была разгледжана [7, с. 67]. Спрэчным з'яўляецца пытанне стварэння нацыянальнай татарскай школы ў Мінску. Прамых сведчанняў існавання такой установы народнай асветы на татарскай мове даследчыкамі не выяўлена, але ёсць звесткі аб тым, што ў беларускай польскамоўнай газеце «ORKA» за 21 студзеня 1928 года змешчаны фотаздымак з надпісам «Дзеці ў татарскай школе». У гэты час у БССР былі зроблены спробы арганізаваць першасныя структуры (пачатковыя класы, групы ліквідацыі непісьменнасці) такой школы. Але татарскімі яны маглі быць толькі ў сэнсе камплектавання [8, с. 32]. Вядома, што пасля 1917 года татарам у Мінску была перададзена сямігадовая школа № 26 па вул. Вызвалення, якая мела афіцыйную назву «Татарская». Але падчас германскай акупацыі яна была ў іх адабрана. Аб неабходнасці вяртання яе мінскім татарам пісаў у лісце да нацкамісіі ЦВК БССР адзін з лідэраў беларускіх татараў Ях'я Хасанавіч Гембіцкі.

«Можна адзначыць, што савецкая ўлада надавала дастаткова важнае значэнне павышэнню культурнага ўзроўню насельніцтва. Аднак змест, формы і накіраванасць дадзенай працы з самага пачатку браліся пад жорсткі кантроль. Прычым улада не ставіла мэтай адраджэнне ці замацаванне традыцыйных укладаў нацменшасцей, асноўнай задачай нацыянальнай палітыкі з'яўлялася іх саветызацыя» [7, с. 28].

У выніку згортвання палітыкі беларусізацыі і заняпаду нацыянальна-культурнага будаўніцтва да сярэдзіны 30-х гадоў адзінай формай нацыянальнага будаўніцтва сярод татараў БССР заставалася нацыянальна-гаспадарчае. Нацыянальныя татарскія кааператывы былі створаны ў Мінску («Чырвоны агароднік») і Смілавічах («Чырвоны Профінтэрн»). Яны грунтаваліся на базе традыцыйных заняткаў татараў агародніцтвам [3, с. 144]. Палітыка землеўпарадкавання, звязаная з перасяленнем татараў у іншыя раёны СССР (на поўдзень Украіны і Крым), якую праводзілі ўлады, павінна была вырашыць праблему малазямелля. Аднак у выніку эканамічная палітыка савецкай улады значна пагоршыла дабрабыт і асновы гаспадарчай дзейнасці беларускіх татараў. Значную ролю ў гэтым адыграла прымусовая калектывізацыя, якая стала трагедыяй для ўсіх татараў-агароднікаў. Дарэчы, у 1945 годзе татары з заходніх раёнаў Беларусі амаль што цэлымі абшчынамі пераязджалі ў Польшчу ў якасці рэпатрыянтаў. Па некаторых звестках, выехала каля 2 тысяч татараў [9, с. 70].

Што датычыцца рэлігійнай палітыкі савецкай улады, то яна была накіравана супраць існавання розных канфесій, у тым ліку і мусульманскай. Антырэлігійная прапаганда на «сталінскай мове» азначала знішчэнне мячэцей і мулаў. У 1936 годзе мячэць у Мінску была зачынена і перададзена пад склад харчовых тавараў. Годам раней былі знішчаны мячэці ў Смілавічах і Капылі, спалена мячэць ва Уздзе. Быў «раскулачаны» і высланы на поўнач са сваёй шматлікай сям'ёй і загінуў у выгнанні апошні мула Уздзенскай мячэці Мухамед Александровіч (у 1930 годзе), расстраляны ў Чэрвеньскай турме мула Смілавіцкай мячэці Мустафа Хасяневіч, мязім (ці муэдзін, памочнік мулы) Адам Хасяневіч і былы мула гэтай мячэці Асан Паўтаржыцкі (у 1937 годзе). Неабгрунтаваныя рэпрэсіі былі значнай часткай тагачаснай палітычнай дзейнасці партыйна-дзяржаўных органаў Беларусі. Яны былі накіраваны не толькі супраць рэлігійных дзеячаў.

Згодна з дакладам намесніка паўнамоцнага прадстаўніка АДПУ па Заходняму краі І. Апанскага, ва ўмовах нэпа ўзрастала актыўнаць нацыянальнай інтэлігенцыі, прадстаўнікоў нацыянальных груп, дзейнасць якіх негатыўна ўспрымалася ўладамі [7, с. 83]. Так, падчас фарсіраваных сацыяльных пераўтварэнняў у 30-я гады шырока праводзілася барацьба супраць так званага нацыянальнага адзінства, якая закранула разам з іншымі нацыянальнасцямі і татараў. Дарэчы, першым прадстаўніком цюркска-мусульманскіх

народаў, абвінавачаным у нацыяналізме, панцюркізме і панісламізме, быў вядомы татарскі дзеяч Султан-Галіеў. Яму таксама прыпісвалася стварэнне і кіраўніцтва падпольнай антысавецкай арганізацыяй у рэгіёне Ідэль-Урала. «Справа Султан-Галіева» была сфабрыкавана органамі ДПУ ў 1923 годзе.

Закранулі пазначаныя працэсы і беларускіх татараў. Паводле дадзеных старшыні Камітэта па архівах і справаводству Рэспублікі Беларусь У. Адамушкі, атрыманых аўтарам на падставе апрацоўкі 40 300 картак персанальнага ўліку на жыхароў Мінска, Мінскай і Віцебскай абласцей, якія былі рэпрэсіраваныя судовымі і несудовымі органамі ў 20 – 50-я гады і рэабілітаваныя ў 1955 – 1994 гадах, 49 чалавек былі татарамі (0,12 % ад усёй колькасці рэпрэсіраваных). Але У. Адамушка паведамляе, што вывучаныя ім 40 300 людскіх лёсаў складаюць толькі 6,5 % ад ацэначнай лічбы ўсіх ахвяр рэпрэсій 20 – 50-х гадоў у Беларусі.

Найбольшая хваля рэпрэсій прыйшлася на 1936 – 1938 гады. Аднак і пазней ніхто не мог быць застрахаваны ад абвінавачванняў і іх наступстваў. Асабліва гэта датычылася насельніцтва тых рэгіёнаў, што былі ўключаны ў склад СССР у 1939 – 1940 гады: Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, Прыбалтыкі, Бесарабіі і Паўночнай Букавіны. Не маглі не закрануць гэтыя працэсы і татарскае насельніцтва, якое пражывала на далучаных да БССР землях. У 1940 годзе быў арыштаваны адзін з самых уплывовых і вядомых татарскіх дзеячаў Альгерд Найман-Мірза Крычынскі. Не пазбегнуў рэпрэсій і ўраджэнец Ляхавіч імам Варшаўскай гміны, капелян 1-га татарскага эскадрона 13-га палка віленскіх уланаў Алі Варановіч. Былі рэпрэсаваны цэлымі сем'ямі ваенныя і грамадскія дзеячы з ліку слонімскіх татараў: маёр Давід Яновіч-Чаінскі і палкоўнік Мацей Байрашэўскі.

Увогуле ў выніку здзейсненага намі пошуку на падставе дадзеных Цэнтра «Карта» ў Варшаве, які займаецца зборам інфармацыі аб рэпрэсаваных савецкімі ўладамі польскіх грамадзянах, налічваецца каля 35 чалавек з ліку татарскага насельніцтва з заходніх рэгіёнаў Беларусі, дэпартаваных і арыштаваных у 1939 – 1941 гадах [10]. Акрамя таго, улічваючы дадзеныя, якімі мы валодаем яшчэ аб 15 чалавеках, агульная лічба рэпрэсаваных татараў складае каля 1 % ад татарскай дыяспары Заходняй Беларусі і каля 0,03 % ад усіх рэпрэсаваных (каля 160 тысяч чалавек) з заходніх абласцей Беларусі за вызначаны перыяд [11, с. 215; 12, с. 271; 13].

Калі весці размову аб выніках далучэння заходнебеларускіх зямель да БССР у дачыненні да рэлігійна-культурнага жыцця татарскага насельніцтва, то трэба адзначыць, што з 1939 года да пачатку Вялікай Айчыннай вайны савецкія ўлады не паспелі дасягнуць поспехаў у распаўсюджванні атэістычных поглядаў сярод татарскага насельніцтва дадзенага рэгіёна: працягвалі дзейнічаць мячэці, і час ад часу праводзіліся заняткі па мусульманскай рэлігіі ў годжыя.

**Высновы.** Жыццё татарскага насельніцтва ў складзе БССР знаходзілася пад уплывам тых ідэалагічных працэсаў, сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных пераўтварэнняў, якія мелі месца ў рэспубліцы. Татарская супольнасць развівалася пад уплывам працэсаў саветызацыі, што, дарэчы, у значнай ступені прадвызначыла матывацыю іх антыфашысцкай дзейнасці падчас Вялікай Айчыннай вайны.

Калі прааналізаваць прычыны непрацяглага існавання форм нацыянальнага будаўніцтва сярод татараў БССР у гэтыя гады, то можна сцвярджаць, што яны былі своеасаблівымі прыладамі для разбурэння жыццёвага ўкладу татарскага насельніцтва Беларусі і асяродкаў захавання этнаканфесійнай самабытнасці гэтага народа. Нацыянальныя адметнасці супярэчылі палітыцы ўлад. Замацаванне і ўдасканаленне нацыянальных праяў не толькі ў культуры, а таксама і ў грамадска-палітычным жыцці прыводзілі да развіцця нацый, што супярэчыла накіраванасці кампартыі да стварэння новай адзінай супольнасці людзей. Таму развіццё нацыянальных культур у БССР прайшло шлях ад пэўнай лаяльнасці да нацыянальнага ў 20-я гады да варожасці да яго з боку кіраўнікоў дзяржавы ў 30-я гады XX стагоддзя, калі вынішчаліся многія праявы нацыянальнай актыўнасці ў культурным і грамадска-палітычным жыцці.

Несбалансаванасць канфесійнай палітыкі савецкай дзяржавы стала для татарскай меншасці асабліва адчувальнай, так як веравызнанне ісламу з'яўляецца для татараў вельмі каштоўным кансалідацыйным фактарам, які яны імкнуліся зберагчы на працягу стагоддзяў. Аднак трэба адзначыць, што пры ўсіх пазначаных акалічнасцях татары ўсё ж канчаткова не страцілі свае нацыянальныя і канфесійныя адметнасці. Гэта стала магчымым у выніку трывалых каранёў іх этнічнай самабытнасці, нягледзячы на пэўную акультурацыю з мясцовым беларускім насельніцтвам.

## ЛІТАРАТУРА

1. Всесоюзная перепись населения 1939 года. Основные итоги; под ред. Ю.А. Полякова. – М.: Наука, 1992. – 256 с.
2. Лакотка, А. Мячэці Беларусі / А. Лакотка // Татары-мусульмане на землях Беларусі, Літвы і Польшчы: матэрыялы першай міжнар. навук.-практ. канф., прысв. да 600-годдзя татарскага асадніцтва на землях Беларуска-Літоўскай дзяржавы, распачатага пры Вітаўце Вялікім, Мінск, 26 – 27 сак. 1993 г.: у 3 ч.; Беларус. дзярж. пед. ун-т; рэдкал.: І. Александровіч [і інш.]. – Мінск, 1995. – Ч. 2. – С. 236 – 246.

3. Карашчанка, І. Нацыянальнае будаўніцтва сярод татараў БССР у 1920 – 1930 гады / І. Карашчанка // Татары-мусульмане на землях Беларусі, Літвы і Польшчы: матэрыялы першай міжнар. навук.-практ. канф., прысв. да 600-годдзя татарскага асадніцтва на землях Беларуска-Літоўскай дзяржавы, распачатага пры Вітаўце Вялікім, Мінск, 26 – 27 сак. 1993 г.: у 3 ч. / Беларус. дзярж. пед. ун-т; рэдкал.: І. Александровіч [і інш.]. – Мінск, 1994. – Ч.1. – С. 142 – 145.
4. Вырезки из газет по вопросам белоруссизации, борьбы с шовинизмом и антисемитизмом (5 января 1929 г. – 2 января 1930 г.) // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Фонд 701. – Воп. 1. – Спр. 97.
5. Протоколы заседаний и планы окружных национальных комиссий БССР (8 декабря 1929 г. – 27 декабря 1930 г.) // НАРБ. – Фонд 701. – Воп. 1. – Спр. 94.
6. Канапацкі, І.Б. Ях'я Гембіцкі – лідэр адраджэння беларускіх татараў (да 120-й гадавіны з дня нараджэння) / І.Б. Канапацкі // Bialoruskie zeszyty historyczne. – 2005. – № 23. – С. 213 – 230.
7. Пушкін, І.А. Нацыянальныя меншасці БССР у грамадска-палітычным і культурным жыцці. 20-я гады XX ст.: дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / І.А Пушкін. – Мінск, 2002. – 117 л.
8. Канапацкі, І.Б. Адукацыя татараў на Беларусі ў 1920 – 1930 гг. / І.Б. Канапацкі // Нацыянальная адукацыя. Нацыянальная адукацыя і полікультурная парадыгма: тэмат. зб. навук. прац; Міжнар. акад. вывучэння нац. меншасцей; навук. рэд. С.А. Яцкевіч. – Брэст, 1996. – Кн. 7. – С. 30 – 32.
9. Александрович, Х.М. Вторая мировая война и ассимиляция белорусско-польских татар (к 60-летию окончания войны) / Х.М. Александрович // Народы СССР в годы Великой Отечественной войны 1941 – 1945 гг.: материалы XI междунар. науч.-практ. конф., Минск, 30 – 31 мая 2005 г. / Белорус. гос. пед. ун-т; редкол.: И.Б. Канапацкий [и др.]. – Минск, 2006. – С. 60 – 71.
10. Baza elektroniczna Fundacji Osrodka KARTA, Indeks Represjonowanych, Warszawa.
11. Канфесіі на Беларусі / В.В. Грыгор'ева [і інш.]; навук. рэд. У.І. Навіцкі. – Мінск: ВП «Экаперспектыва», 1998. – 340 с.
12. Ruchniewicz, M. Stosunki narodowosciowe w latach 1939 – 1948 na obszarze tzw. Zachodnej Bialorusi / M. Ruchniewicz // Przemiany narodowosciowe na kresach wzchodnich II Rzeczypospolitej: zb. artyk.; pod red. S. Ciesielskiego. – Torun: wydawnictwo Adam Marszalek, 2003. – S. 242 – 322.
13. Асабісты архіў сучаснага імама Слонімскай абшчыны С.М. Байрашэўскага.

*Паступіў 05.10.2012*

## NATIONAL AND CULTURAL DEVELOPMENT OF TATAR COMMUNITY ON THE TERRITORY OF BSSR IN 20 – 30-S OF THE 20$^{TH}$ CENTURY

***S. GRIBOVA***

*The article is devoted to national and cultural development of Tatar population in BSSR in 20 – 30-s of the 20$^{th}$ century under influence of soviet policies concerning national minorities. The author provides information about the efforts of the authorities to promote nationalization in 1920-s through establishing of Tatar library, opening national schools, as well as creating Tatar national cooperatives. However, these means were rather insufficient and in the 1930-s manifestations of national ideas at all levels (cultural, religious, social and political) were banned. That all led to groundless charges and repressions. The main goal of the national policy was to "sovietize" the minority, to form atheistic attitude and promote communistic ideals. Obviously, the Tatar community was exposed to this policy as well. Thus, the living of Tatar population as a part of BSSR was affected by those ideological processes as well as social, economical and political changes that took place in the republic as a whole.*